9. Калі вы заўважылі, што частка аўдыторыі менш уважліва слухае вас, звярніце позірк у яе бок, нібы звяртаецеся менавіта да яе.

10. Калі вы заўважылі, што аўдыторыя стамілася, пачніце гаварыць цішэй, а затым рэзка загаварыце гучней, але не настолькі, каб аўдыторыя адчула, што вы жадаеце падбадзёрыць яе.

11. Калі вы заўважылі, што словы, толькі што сказаныя вамі, знайшлі падтрымку аўдыторыі, то пастарайцеся неадкладна развіць закранутую тэму.

12. У момант душэўнага ўздыму, выкліканага адабрэннем аўдыторыі, не страчвайце ўсё ж самакантролю.

13. Правакацыйныя рэплікі таксама не павінны выводзіць вас з раўнавагі.

14. У крытычныя моманты выступлення неабходна гаварыць пераканана, упэўнена, з актуалізацыяй кожнага слова.

15. Ні ў якім разе не паказвайце, што прамова даецца вам з цяжкасцямі, што вы стаміліся ці адчуваеце сябе няўпэўнена.

16. Скончыўшы выступленне, не забывайце падзякаваць прысутным за ўвагу.

Ніколі не дазваляйце, нават тады, калі спакуса вельмі вялікая, ушаноўваць сябе пасля выступлення і ўлагоджваць сваё самалюбства несціханымі воплескамі.

**Тоўкач І.,**
магістр

## ТВОРЧАСЦЬ КАМПАЗІТАРАЎ БЕЛАРУСІ Ў ГАЛІНЕ НАРОДНА-ІНСТРУМЕНТАЛЬНАЙ МУЗЫКІ

У 20-я гады на Беларусі зарадзілася новая галіна кампазітарскай творчасці — музыка для народных інструментаў, ансамбляў і аркестраў.

Падставай для стварэння гэтай галіны творчасці было з'яўленне першых выканальніцкіх калектываў. Менавіта



Репозиторий БГУКИ

ўдзельнікі гэтых калектываў сталі тымі кампазітарамі, якія пачалі пісаць музыку для сябе. Сярод першых твораў можна назваць апрацоўкі Д.Захара для беларускага аркестра народных інструментаў, п'есы Г.Самохіна для секстэта домраў, апрацоўкі І.Жыновіча для цымбалаў, апрацоўкі Жыновіча—Вальтэра для цымбалаў з фартэпіяна.

У 30-я гады з'явіліся першыя творы прафесійных кампазітараў у галіне народна-інструментальнай музыкі. Сярод кампазітараў, якія працавалі ў гэтай галіне творчасці, можна назваць М.Аладава, А.Туранкова, Я.Цікоцкага, Р.Пуксты, Н.Сакалоўскага.

Аналізуючы дзейнасць беларускіх кампазітараў у 20—30-я гады, трэба адзначыць, што на гэтым этапе вялікую ўвагу кампазітары надавалі творам для беларускага аркестра народных інструментаў (53% ад усяго рэпертуару) і цымбалаў (39 %). Адзінкавыя творы складалі рэпертуар для секстэта домраў, і зусім не закранула творчасць кампазітараў музыку для баяна, домры, балалайкі, гітары, дудкі.

На наступным этапе развіцця народна-інструментальнай музыкі — 1946—60-я гады — значна актывізавалася дзейнасць беларускіх кампазітараў.

Разам з кампазітарамі, якія пісалі ў даваенныя гады, з'явіўся шэраг новых імёнаў. Сярод гэтых кампазітараў Дз. Камінскі, Г. Вагнер, Я. Глебаў, Р. Сурус, П. Падкавыраў, У. Алоўнікаў, Ю. Семяняка, Дз. Смольскі і інш.

Асабліва плённа працавалі беларускія кампазітары ў галіне народна-аркестравай музыкі. Амаль у тры разы ў параўнанні з даваенным перыядам павялічылася колькасць твораў для беларускага аркестра народных інструментаў.

Сфера дзейнасці кампазітараў у гэты перыяд развівалася ў бок засваення новых жанраў: з'явілася музыка для баяна, домры, балалайкі, ансамбляў. Таму трохі зменшылася цікавасць да цымбалаў.

Сучасны этап — 1970—90-я гады — стаў этапам якасных змен у галіне народна-інструментальнай музыкі.

У апошнія дзесяцігоддзі пачалі кампазітарскую дзейнасць В. Войцік, В. Іваноў, А. Клеванец, Г. Ерма-

Репозиторий БГУКИ

чэнкаў, У. Кур'ян, А. Рашчынскі, В. Помазаў, А. Мдзівані і інш. Дзейнасць кампазітараў у гэты перыяд характарызуецца большай цікавасцю да асобных народных інструментаў. Так, амаль у тры разы павялічылася колькасць твораў для цымбалаў. Больш чым у два разы ўзрасла кампазітарская творчасць у галіне музыкі для баяна. Прыкладна ў паўтара разы павялічылася колькасць твораў для домры, у 4,5 разы — для дудкі. У апошні перыяд былі напісаны першыя творы для гітары.

Абагульняючы дзейнасць кампазітараў Беларусі ў галіне народна-інструментальнай музыкі, трэба заўважыць, што гэтая галіна творчасці, як ніякая іншая, прыцягвала ўвагу кампазітараў. Няма амаль ніводнага кампазітара Беларусі, які б не напісаў твораў для асобных народных інструментаў, ансамбляў ці аркестраў.

Кароткі, усяго 70 гадоў, перыяд існавання народна-інструментальнай культуры акадэмічнага тыпу даваў кампазітарам пэўную свабоду эксперыменту. Амаль кожнага з кампазітараў можна назваць наватарам у новай для Беларусі галіне кампазітарскай творчасці.

Репозиторий БГУКИ

**Ражкова Л.Л.,**
аспірантка кафедры
народна-інструментальнай творчасці

## НЕКАТОРЫЯ ПЫТАННІ ФАРМІРАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ДЗІЦЯЧЫХ ФАЛЬКЛОРНЫХ ГУРТОЎ

Нацыянальная самасвядомасць асобы — праблема, якая прыцягвае да сябе ўвагу айчынных і замежных навукоўцаў. Філасофска-сацыялагічны яе аспект атрымаў сваю распрацоўку на працягу 60—90-х гадоў XX стагоддзя. Педагогі ж звярнуліся да гэтай тэмы толькі напрыканцы 80-х гадоў.